# <u>Перадвыбарная праграма кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь</u>

# <u>Ганны Канапацкай "Беларусь для людзей!"</u>

Шаноўныя выбарцы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь!

Неўзабаве кожнаму з нас трэба будзе зрабіць выбар – выбраць будучыню нашай краіны, будучыню сваю, будучыню дзяцей і ўнукаў.

Ад выбару кожнага з нас залежыць вельмі шмат.

Бо, па сутнасці, сёння перад краінай усяго два шляхі.

Адзін шлях – гэта шлях да далейшай дэпапуляцыі – да змяншэння колькасці насельніцтва, дэградацыі працоўных і вытворчых рэсурсаў, самаізаляцыі ў коле ворагаў. Гэта шлях, на які нас спрабуюць накіраваць знешнія сілы.

Другі шлях – гэта шлях адзінства і згоды, развіцця і прагрэсу, калектыўных высілкаў усіх слаёў грамадства, скіраваных на захаванне нашай нацыянальнай самаідэнтычнасці. Гэта шлях міру і стварэння.

Таму, перш за ўсё, мы павінны абараніць тое, што ў нас ёсць, і прыкласці намаганні дзеля захавання таго, што можам згубіць ужо ў бліжэйшы час.

І ў першую чаргу нам неабходна захаваць і вярнуць нашае насельніцтва.

Самае каштоўнае багацце Беларусі – гэта нашыя людзі!

За апошнія гады, з моманту здабыцця незалежнасці, натуральнае змяншэнне насельніцтва складае больш за мільён чалавек, дзясяткі тысячаў выехалі з краіны ў апошнія гады. Беларусь апынулася, без перабольшвання, у дэмаграфічнай яміне. Няздольнасць эфектыўна спраўляцца з бягучымі выклікамі падарвала аўтарытэт нашай краіны ў свеце і сярод бліжэйшых суседзяў. Нашыя дзяржаўнасць і незалежнасць знаходзяцца пад перманентнай знешняй пагрозай, перыядычна ператвараючыся ў элемент палітычнага гандлю.

Мая праграма “Беларусь для людзей!” пабудаваная на базавых прынцыпах дэмакратычнай, суверэннай, сацыяльнай дзяржавы – дзяржавы для народу і для кожнага чалавека, які ў ёй жыве.

## НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ

У выніку доўгіх намаганняў і шматвекавой барацьбы наш народ здабыў сваю дзяржаўнасць. Шлях быў цяжкім, але беларускі народ гэта зрабіў.

І мы заўсёды гатовыя абараніць Айчыну ад любых замахаў. Нашыя дзеці, унукі і праўнукі будуць вольна жыць на сваёй зямлі. Яны самі распарадзяцца сваім лёсам.

Пры гэтым не варта забывацца пра свае карані. Кожны момант нашай гісторыі мае права быць захаваным для наступных пакаленняў, і кожны этап развіцця дзяржавы важны для разумення сучаснасці і дакладнага бачання будучыні. І таму атрыбуты гістарычнай памяці ўсіх без выключэння перыядаў станаўлення нашай нацыі заслугоўваюць на сваё месца сярод нацыянальных гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

## НАРОД БЕЛАРУСІ І КОЖНЫ ЯЕ ГРАМАДЗЯНІН ЗАЎСЁДЫ БУДУЦЬ СВАБОДНЫМІ

У гэтым я бачу адну з найважнейшых сваіх задач.

Я цвёрда перакананая ў неабходнасці замацавання і выканання дзяржавай палітычных і прававых нормаў, якія вызначаюць правы і свабоды чалавека – грамадзяніна дэмакратычнай Беларусі, такіх як свабода асобы, свабода выбару, свабода сумлення, свабода веравызнання.

Толькі свабодны чалавек здольны на эфектыўную, плённую і стваральную працу. Менавіта такі чалавек можа быць часцінаю моцнай сям’і, свабоднага народу і моцнай дзяржавы.

## ПРАЦА І ДАБРАБЫТ

Даць кожнаму чалавеку магчымасць зарабляць на прыстойнае жыццё сваёй працай – прынцып, які я заклала ў падмурак далейшага развіцця беларускай эканамічнай мадэлі. Рэфармаваць і мадэрнізаваць эканоміку, захаваць эфектыўныя прадпрыемствы, развіць тэхналагічныя галіны, стварыць новыя працоўныя месцы для людзей – гэта тое, на чым будуць сканцэнтраваныя нашыя намаганні ў бліжэйшы час.

## САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА І ДЭМАГРАФІЯ

Гэта асноўная пазіцыя ў пераўтварэннях, якія я мяркую ажыццявіць на пасадзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Як жанчына і маці, я ведаю ўсе цяжкасці гэтага шляху, а таксама тое, што неабходна здзейсніць для паляпшэння сітуацыі.

Задача росту колькасці насельніцтва нашай краіны ў перыяд майго знаходжання на пасадзе прэзідэнта запатрабуе вырашэння многіх пытанняў і ўнясення істотных зменаў у нашае жыццё.

Сярод першачарговых мною будуць зробленыя наступныя крокі:

– далейшае развіццё і напаўненне практычным зместам мерапрыемстваў па ўзмацненню сацыяльнага забеспячэння мацярынства і дзяцінства;

– рэалізацыя праграмаў па стымуляванню нараджэння дзяцей, стварэнню і ўмацаванню маладых сем’яў, прадастаўленню дадатковых сацыяльных гарантыяў;

– істотная змена і заканадаўчае замацаванне механізму прадастаўлення мацярынскага капіталу і пашырэнне катэгорыяў асобаў, якія маюць права на яго атрыманне, і падставаў яго датэрміновага выкарыстання;

– зніжэнне для жанчын заканадаўча дазволенага ўзросту ўступлення ў шлюб да 17 гадоў (са згоды бацькоў);

– увядзенне для бацькоў, якія маюць пад апекай малалетніх дзяцей, адтэрміноўкі ад тэрміновай службы ва Ўзброеных сілах Рэспублікі Беларусь да дасягнення дзецьмі чатырохгадовага ўзросту;

– падвышэнне прызыўнога ўзросту для праходжання тэрміновай вайсковай службы для мужчын да 20 гадоў з паступовым пераходам да прафесійнай кантрактнай арміі;

– істотныя змены сацыяльнай палітыкі па падтрымцы няпоўных сем’яў, якія маюць пад апекай дзяцей, і сем’яў, якія маюць на ўтрыманні інвалідаў;

– легалізацыя і прадастаўленне заканадаўчых гарантыяў і свабод альтэрнатыўным сем’ям (няпоўныя сем’і; сем’і з адным з бацькоў; тыя, што жывуць у грамадзянскім шлюбе);

– замацаванне заканадаўча інстытуту сурагатнага мацярынства;

– стварэнне сістэмы рэальнай назапашвальнай пенсіі, пры якой невыкарыстаныя пенсіянерам назапашванні перадаюцца спадкаемцам (супругам, дзецям) у выпадку яго смерці;

– выключэнне далейшага падвышэння пенсійнага ўзросту;

– прадастаўленне ўмоваў для вяртання і забеспячэнне гарантыяў для сем’яў і асобаў, якія пакінулі краіну па эканамічных, палітычных ці іншых матывах;

– змягчэнне пакарання з максімальна магчымым прымяненнем амністыі і памілавання ў адносінах да асобаў, якія прыцягнутыя да адказнасці за падзеі папярэдняга электаральнага цыклу, і прыняццё захадаў па іх хутчэйшай сацыяльнай і працоўнай адаптацыі ўнутры краіны.

## БЯСПЕКА І ПАРАДАК

Дэмаграфічны рост і вырашэнне сацыяльных задач маёй праграмы немагчымыя без гарантыяў бяспекі і парадку ў краіне, і ў гэтым я бачу яшчэ адну са сваіх першачарговых задач.

Для гэтых мэтаў мною будзе рэалізаваны комплексны план мерапрыемстваў, якія ўключаюць:

– прыцягненне насельніцтва і ўкараненне перадавых тэхналогіяў у забеспячэнне грамадскай бяспекі;

– узмацненне ўзаемадзеяння праваахоўных органаў і грамадзянскай супольнасці;

– узняццё прэстыжу органаў правапарадку і барацьбы са злачыннасцю.

## МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ

Беларусь – занадта буйная еўрапейская краіна, каб быць проста “мастом” паміж Усходам і Захадам, але недастаткова ваяўнічая і мілітарызаваная, каб быць паміж імі “кантрольна-прапускным пунктам” са сваімі геастратэгічнымі інтарэсамі.

Ёсць дакладнае разуменне, што сёння ў Еўрапейскім Саюзе Беларусь не чакаюць, а ўваходжанне яе ў склад Расійскай Федэрацыі відавочна не патрэбнае ні нам, беларусам, ні расіянам, ні еўрапейцам.

Нашая бягучая задача – умацоўваць мір у рэгіёне і аднаўляць узаемакарысныя працоўныя сувязі з усімі суседзямі, і пры гэтым кіравацца, у першую чаргу, уласнымі прагматычнымі інтарэсамі, і не чакаць таго моманту, калі расійска-еўрапейскае эканамічнае аб’яднанне абыйдзе Беларусь па контуры яе знешніх межаў.

І важнай часткаю гэтага працэсу павінна стаць нармалізацыя з усімі нашымі партнерамі (як з чальцамі Еўрапейскага Саюза, так і з тымі, хто пакуль знаходзіцца на шляху да ўваходжання ў яго) палітычных адносінаў, заснаваных на прынцыпах мірнага суіснавання.

## ЦЫВІЛІЗАВАНАЯ ЗМЕНА ЎЛАДЫ І ЯЕ РЭФАРМАВАННЕ

Я выступаю за бяскроўны, цывілізаваны, дэмакратычны пераход улады ў нашай краіне. Дзеля гэтага я прапаную заканадаўча замацаваць:

– абмежаванне двума чатырохгадовымі тэрмінамі знаходжання адной асобы на вышэйшым дзяржаўным пасту;

– забеспячэнне выканання спецыяльных гарантыяў галаве дзяржавы, які змяняецца, прадстаўнікам вышэйшай дзяржаўнай наменклатуры і чальцам іх сем’яў;

– асаблівы механізм прыцягнення пазначаных асобаў да адказнасці, пры наяўнасці для гэтага дастатковых прававых падставаў;

– забарона на правядзенне пазасудовых абмежаванняў для ўсіх катэгорый грамадзян (люстрацыяў, дыскваліфікацыяў, забаронаў на прафесійную дзейнасць па палітычных матывах).

У перыяд свайго прэзідэнцтва я прапаную правядзенне агульнанароднага рэферэндума па пытанніператварэння сістэмы дзяржаўнага кіравання ў форму парламенцкай рэспублікі.

## ЭКАНОМІКА І ІНВЕСТЫЦЫІ

Доўгія гады існавання ў камфортных умовах савецкай эканамічнай спадчыны – у каманднa-адміністрацыйнай форме кіравання – прывялі да нізкай эфектыўнасці і неўстойлівасці выбудаванай аграрна-прамысловай мадэлі. Негатыўныя наступствы такой эканамічнай палітыкі пачынаюць праяўляцца ўсё болей заўважна.

Ад кіраўніцтва краіны будуць патрэбныя хуткія комплексныя эканамічныя пераўтварэнні, сярод якіх такія рашучыя крокі як:

– падатковая рэформа са зменай сістэмы падаткаабкладання, са змяншэннем нагрузкі і павелічэннем эфектыўнасці выкарыстання падатковых адлічэнняў і кантролю над імі;

– перагляд дзяржаўнай крэдытна-фінансавай і бюджэтнай палітыкі;

– прыватызацыя вызначаных спецыяльнай праграмай дзяржаўных прадпрыемстваў;

– закрыццё неэфектыўных вытворчасцяў з пераразмеркаваннем і сацыяльным забеспячэннем унутраных працоўных рэсурсаў;

– увядзенне інстытуту прыватнай уласнасці на зямлю;

– уцягненне зямлі ў гаспадарчы і фінансавы абарот (з абмежаваннямі па пэўных катэгорыях ворных земляў, якія застануцца ва ўласнасці дзяржавы дзеля забеспячэння харчовай бяспекі);

– разбуйненне сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў састарэлай форме сацыялістычнай калектывізацыі, с наступным перааб’ядненнем іх у дзяржаўныя, дзяржаўна-прыватныя і прыватныя аграпрамысловыя холдынгі;

– заканадаўча замацаваная амністыя капіталу;

– развіццё на дзяржаўным узроўні лічбавай эканомікі, стварэнне інструментаў для атрымання і фарміравання альтэрнатыўных крыптавалютных актываў краіны;

– вяртанне Беларусі статусу аднаго з вядучых еўрапейскіх і сусветных ІТ-хабаў і ўзмацненне канкурэнтных пазіцыяў у гэтай галіне;

– выкананне ўмоваў для адмены санкцыяў, якія негатыўна ўплываюць як на эканоміку Беларусі цалкам, так і на дабрабыт шараговых грамадзян нашай краіны;

– аднаўленне доступу да замежных інвестыцыяў, тэхналогіяў, тавараў і паслугаў;

– прыняццё неабходных захадаў па рэпатрыяцыі бізнесу і ўцягненні ў эканамічны абарот рэлакаваных у папярэднія гады працоўных і інтэлектуальных рэсурсаў;

– стварэнне аптымальных і эфектыўных умоваў для развіцця прадпрымальніцтва, малога бізнесу, прымнажэння нацыянальнага капіталу.

Пасля прыняцця названых мераў можна будзе разлічваць на прыцягненне істотных унутраных і знешніх інвестыцыяў.

Вырашэнне эканамічных задач дазволіць нам даць дадатковы імпульс развіццю нашай краіны як сацыяльнай дзяржавы.

## САЦЫЯЛЬНАЯ ДЗЯРЖАВА

Менавіта на забеспячэнне самых высокіх сацыяльных стандартаў жыцця нашых грамадзян і будуць накіраваныя ўсе мае эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні. Беларусь перастане быць краінай з адтокам працоўных рэсурсаў і зробіцца прыцягальным месцам для прафесійнай адукацыі і развіцця моладзі, эфектыўнай працы працаўнікоў усіх узростаў і якаснага жыцця старэйшага пакалення. Неабходна толькі з удзячнасцю прыняць і правільна распарадзіцца тым, што для нас стварылі і захавалі нашыя папярэднікі.

І безумоўна ў гэтым жа сацыяльным кантэксце – гендэрнае пытанне.

Я перакананая ў тым, што сёння жанчына, якая валодае палітычным і грамадскім досведам, сапраўдны патрыёт сваёй краіны, мае высокія шанцы быць абранай на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У сучасным шматаблічным свеце, які дынамічна змяняецца, мужская мадэль адзінаасобнага кіравання дзяржавай больш не можа лічыцца адзіна магчымай і эфектыўнай. Асноватворнымі крытэрамі выбару лідара нашай дзяржавы павінны быць не гендэрная ідэнтычнасць ці персанальная харызма, а любоў да Радзімы, чысціня намеру і давер народу.

Дэмакратычная, сацыяльна і эканамічна развітая, з ростам насельніцтва Беларусь – асноўная мэта і задача маёй палітычнай дзейнасці. Для гэтага ў мяне ёсць усё: воля, моц, упэўненасць у сваёй праўдзе, прафесійная каманда і час.

Мне патрэбная вашая падтрымка. Мы пабудуем разам шчаслівую і квітнеючую краіну – Беларусь, гатовую да будучыні!

«Беларусь для людзей!»